## Канферэнцыі

# Павага нашчадкаў

"Другія Тышкевіцкія чытанні" — пад такой назвай праходзіла ў Лагойскім гісторыка-краязнаўчым музеі навуковая канферэнцыя, прысвечаная Канстанціну і Яўстафію Тышкевічам, заснавальнікам айчыннай археалогіі, краязнаўства і музеялогіі.

Удзел у канферэнцыі прынялі вядомыя навукоўцы з Інстытута гісторыі НАН Беларусі, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, краязнаўцы і музейныя супрацоўнікі з Лагойска і Вілейкі. Пры падрыхтоўцы сваіх выступленняў яны звярнуліся да розных аспектаў багатай спадчыны братоў Тышкевічаў, якія пры жыцці атрымалі прызнанне ў навуковых колах Расіі і іншых краін свету.

Тэматычны дыяпазон паведамленняў на канферэнцыі вызначаўся разнастайнасцю. Асаблівую цікавасць выклікалі кароткія даклады "Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў у беларускую археалогію", "Гравюры ў мастацкай калекцыі К. і Я. Тышкевічаў", "Экспедыцыйнае даследаванне Лагойшчыны ў 1923 г".

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ